Цана 10 кап. (грош.)

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 13
6 кастрычніка 1939 г.
Пятніца

Пад сонцем Сталінскай Канстытуцыі разам з народамі СССР будзем будаваць новае шчаслівае і радаснае жыццё

Да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі

Ад Часовага Упраўлення гор. Беластока

Зварот

Польская памешчыцка-капіталістычная дзяржава аснованая на безлітаснай эксплаатацыі і рабаўніцтве працоўных, на нацыянальным прыгнечанні аказалася яўна несастаяцельнай, развалілася і фактычна перастала існаваць. Польскі ўрад не змог арганізаваць абарону дзяржавы, кінуў народы, насяляючыя Польшчу, на волю лёсу і захваціўшы золата, уцёк за-граніцу.

Совецкі урад палічыў сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам—народам, насяляючым Заходнюю Беларусь. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з чэсцю выканала ўскладзеную на яе Комуністычнай Партыяй і Совецкім Урадам гістарычную задачу. Народы Заходняй Беларусі пазасёлы вызваліліся магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй ад эксплаатацыі польскіх памешчыкаў і капіталістаў, ад жорсткага нацыянальнага прыгнёту.

Чырвоная Армія абараніла жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі ад разарэння і знішчэння. Насельніцтва Заходняй Беларусі атрымала цяпер магчымасць зажыць радасным, свабодным, мірным і шчаслівым жыццём.

Цяпер наступіў час для народаў Заходняй Беларусі сказаць сваё слова аб стварэнні новага дзяржаўнага ўстройства, аб стварэнні ўлады, якая-б цалкам служыла інтарэсам народа і была-б уладаю народа, уладаю працоўных.

Неабходна вызначыць характар будучай улады, каб затым прыступіць к яе стварэнню. Неабходна вырашыць пытанне аб уваходжанні абласцей Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і тым самым у Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Тады нічыя захватніцкая рука ніколі не пасмее пасягнуць на нашу мірную працу. Заходняя Беларусь будзе апірацца на магутнасць усяго вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных рэспублік.

Вынесці гэтыя гістарычныя рашэнні можа і павінен аўтарытэтны орган, які выражае карэнныя інтарэсы працоўных, волю і думку народа. Такім органам павінен з'явіцца Народны Сход Заходняй Беларусі. Ён павінен складацца з дэпутатаў, якіх выбярэ і акажа высокае давер'е сам Народ.

Часовае Упраўленне гор. Беластока выносіць прапанову склікаць Народны Сход для рашэння асноўных пытанняў дзяржаўнага устройства, бярэ на сябе ініцыятыву стварэння камітэта па арганізацыі выбараў дэпутатаў Народнага Схода і запрашае Часовыя Ўпраўленні гарадоў дэлегіраваць сваіх прадстаўнікоў у ствараемы камітэт па арганізацыі выбараў.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Заходняй Беларусі з поўным адабрэннем сустрэнуць прапанову аб скліканні Народнага Схода і акажуць Народнаму Сходу поўную і актыўную падтрымку ў вырашэнні стаячых перад ім пытанняў.

Насельніцтва Заходняй Беларусі поўны рашучасці, на аснове Ленінска - Сталінскай нацыянальнай палітыкі, разам з усім совецкім народам, разам з працоўнымі Совецкай Беларусі будаваць новае, светлае, радаснае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

У вялікім Совецкім Саюзе працоўныя Заходняй Беларусі бачаць сваю соцыялістычную радзіму, сваю бацькаўшчыну. На выбары дэпутатаў у Народны Сход рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Заходняй Беларусі пойдуць пад лозунгам устанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі Совецкай улады, як улады сапраўды народнай; пад лозунгам уваходжання Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі; пад лозунгам адабрэння канфіскацыі памешчыцкіх зямель у карысць сялян; пад лозунгам патрабавання нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

Гэтыя патрабаванні працоўныя Заходняй Беларусі аднадушна падтрымаюць і будуць энэргічна змагацца за правядзенне іх у жыццё.

Няхай жывуць Народы Заходняй Беларусі!

Няхай жыве Народны Сход Заходняй Беларусі!

Няхай жыве вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і яго непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі друг, настаўнік і правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

Часовае Упраўленне гор. Беластока:

Б. В. Гайсін (старшыня).

М. І. Маркаў.
М. І. Д'ячук. } члены
А. Г. Машэвіцкі.

гор. Беласток,
5/X—1939 г.

Абвяржэнне ТАСС

Лонданскія газеты „Дэйлі Геральд" і „Дэйлі Мейл", спасылаючыся на амерыканскую газету „Нью Ёрк Таймс", паведамляюць аб правадзімай нібыто канцэнтрацыі совецкіх войск каля граніц кітайскай правінцыі Сіньцзян і аб увозе іх ў межы Сіньцзяна. ТАСС упоўнаважана заявіць, што гэта паведамленне з'яўляецца злосным вымыслам, пушчаным у ход для якіхсці правакацыйных мэтаў.

К забароне компартыі ва Францыі

НЬЮ - ЁРК, 5 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва «Юнайтэд Прэсс», спасылаючыся на даставерныя крыніцы, паведамляе з Парыжа, што Далад'е прадпалагае выдаць дэкрэт аб роспуску парламента і затым пачаць праследаванні комуністычных дэпутатаў, пазбавіўшы іх дэпутацкай недатыкальнасці.

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі паміж СССР і Эстоніяй

4 кастрычніка ў Міністэрстве Замежных Спраў Эстоніі міністр замежных спраў п. К. Сельтэр і прадстаўнік Совецкага Саюза тав. Бачкароў абмяняліся граматамі аб ратыфікацыі пакта аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй.

З моманта абмена ратыфікацыйнымі граматамі пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй, у адпаведнасці з артыкулам VI пакта, уступіў у сілу. (ТАСС).

Аб заключэнні пакта аб узаемадапамозе паміж СССР і Латвійскай Рэспублікай

На працягу 2—5 кастрычніка 1939 года ў Маскве адбываліся перагаворы паміж Старшынёй Соўнаркома і Наркомам Замежных Спраў тов. Молатавым і Міністрам Замежных Спраў Латвіі М. Мунтэрсам па пытанню аб заключэнні пакта аб узаемадапамозе паміж СССР і Латвіяй.

У перагаворах прымалі ўдзел т. т. Сталін, Патёмкін і поўпрэд СССР у Латвіі тов. Зотаў, а з боку Латвіі — Пасланнік Латвійскай Рэспублікі ў СССР п. Коціньш.

Перагаворы закончыліся падпісаннем 5 кастрычніка пакта аб узаемадапамозе. Тэкст пакта аб узаемадапамозе прыводзіцца ніжэй.

Пакт аб узаемадапамозе паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Латвійскай Рэспублікай

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР, з адной стараны, і

Прэзідэнт Латвійскай Рэспублікі, з другой стараны,

у мэтах развіцця ўстаноўленых мірным дагаворам ад 11 жніўня 1920 года дружаственных адносін, аснованых на прызнанні незалежнай дзяржаўнасці і неўмяшання ва ўнутраныя справы другой Стараны;

прызнаючы, што мірны дагавор ад 11 жніўня 1920 года і дагавор аб ненападзенні і мірным вырашэнні канфліктаў ад 5 лютага 1932 года па ранейшаму з'яляюцца прочнай асновай іх узаемных адносін і абязацельстваў;

пераконаныя, што інтарэсам абодвух дагаварваючыхся Старон адпавядае вызначэнне дакладных умоў забяспечэння ўзаемнай безапаснасці.

прызналі неабходным заключыць паміж сабою ніжэйнаступны пакт аб узаемадапамозе і назначылі для гэтай мэты сваімі ўпаўнаважанамі

Прэзідыум Вярхоўнага Совета ССР

В. М. МОЛАТАВА, Старшыню Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў.

Прэзыдэнт Латвійскай Рэспублікі:

ВІЛЬГЭЛЬМА МУНТЭРСА, Міністра Замежных Спраў, якавыя ўпаўнаважаныя па ўзаемным прад'яўленні сваіх поўнамоцтваў, знайдзеных складзенымі ў належнай форме і належачым парадку згадзіліся аб ніжэйнаступным:

Артыкул I.

Абедзве дагаварваючыяся Стораны абавязваюцца аказваць адна другой усякую дапамогу, у тым ліку і ваенную, у выпадку ўзнікнення прамога нападу або пагрозы нападу з боку любой вялікай еўрапейскай дзяржавы ў адносінах марскіх граніц Дагаварваючыхся Старон у Балтыйскім моры, або сухапутных іх граніц праз тэрыторыю Эстонскай або Літоўскай Рэспублік, а роўна і указаных у артыкуле III баз.

Артыкул II.

Совецкі Саюз абавязваецца аказваць Латвійскай Арміі дапамогу на льготных умовах узбраеннем і іншымі ваеннымі матэрыялами.

Артыкул III.

Латвійская рэспубліка, у мэтах забяспячэння безапаснасці СССР і ўмацавання сваёй уласнай незалежнасці прадстаўляе Саюзу права мець у гарадах Ліепая (Лібава) і Вентспілс (Віндава) базы ваенна-марскога флота і некалькі аэрадромаў для авіяцыі на правах арэнды па сходнай цане.

Точныя месцы для баз і аэрадромаў адводзяцца і іх граніцы вызначаюцца па ўзаемнаму пагадженню. У мэтах аховы Ірбенскага праліва Савецкаму Саюзу праластаўляецца права, на тых-жа умовах, саарудзіць базу берагавой артылерыі на ўзбярэжжы паміж Вентспілс і Пітрагс. У мэтах аховы марскіх баз, аэрадромаў і базы берагавой артылерыі Совецкі Саюз мае права трымаць ва ўчастках, адведзеных пад базы і аэрадромы за свой кошт строга абмежаваную колькасць совецкіх наземных і наветраных узброенных сіл, максімальная колькасць якіх вызначаецца асобай згодай.

Артыкул IV.

Абедзве Дагаварваючыяся Староны абавязваюцца не заключаць якіх-н будзь саюзаў або ўдзельнічаць у каалцыях, накіраваных супроць адной з Дагаварваючыхся Старон.

Артыкул V.

Правядзенне ў жыццё гэтага пакта ні ў якой меры не павінна закранаць суверэнных праў дагаварваючыхся старон, у прыватнасці іх дзяржаўнага ўстройства, эканамічнай і соцыяльнай сістэмы і ваенных мерапрыемстваў.

Участкі, адводзімыя пад базы і аэродромы (арт. III) застаюцца тэрыторыяй Латвійскай рэспублікі.

Артыкул VI.

Гэты пакт уступае ў сілу з абменам актаў аб ратыфікацыі. Абмен актаў будзе утворан у горадзе Рыга на працягу 6 дзён з дня падпісання гэтага пакта.

Тэрмін дзеяння гэтага пакта дзесяць год. прычым, калі адна з дагаварваючыхся старон не прызнае неабходным дэнансіраваць гэты пакт за год да канца тэрміна, апошні аўтаматычна прадаўжае сваё дзеянне на наступныя дзесяць год.

У пасведчанне гэтага паімянованыя вышэй Упоўнаважаныя падпісалі гэты пакт і прылажылі да яго свае пячаткі.

Учынена ў гор. Маскве ў двух арыгіналах на рускай і латвійскай мовах 5 кастрычніка 1939 года.

В. Молатаў. **В. Мунтэрс.**

Камюніке аб совецка-латвійскіх перагаворах

У гутарцы, меўшай месца ў звязку з падпісаннем латвійска-совецкага пакта аб узаемадапамозе паміж Старшынёй СНК Народным Камісарам Замежных Спраў СССР тав. В. М. Молатавым і міністрам Замежных спраў Латвіі п. Вільгельмам Мунтэрсам у прысутнасці тав. І. В. Сталіна і латвійскага пасланніка п. Ф. Коціньша, абедзве стораны ўстанавілі сваё аднагалоснае думанне аб тым, што ў інтарэсах паспяховага правядзення ў жыццё Пакта аб узаемадапамозе неабходным фактарам з'яўляецца ўзаемнае давер'е, устанавіўшаеся ў працягу доўгіх год развіцця існуючых дружаственых узаемаадносінах паміж двума дзяржавамі.

Палажыўшы у аснову Пакта аб узаемадапамозе незыблемыя палажэнні мірнага дагавора і дагавора аб ненападзенні, абедзве стораны ізноў падцвярдзілі безагаворачнае прызнанне суверэнных праў кожнае дзяржавы, іх прынцыпа неўмяшацелства ў яе ўнутраныя справы. Пераканаўшыся на доўгалетнім вопыце, што развіццё дзяржаўных сістэм абодвух краін не зьяўляецца перашкодай для пладатворнага супрацоўніцтва паміж імі, кожная старана заявіла, што ў новых акалічнасцях, створаных Пактам аб узаемадапамозе, яна заўсёды будзе кіравана павагай да дзяржаўнай, соцыяльнай і эканамічнай структуры другой стараны, умацоўваючы такім чынам асновы мірнага дабрасуседскага супрацоўніцтва паміж іх народамі.

Абед у Старшыні Соўнаркома Саюза ССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава ў чэсць Міністра Замежных спраў Латвіі п. Мунтэрса

5 кастрычніка г. г. Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш Ц. М. Молатаў даў абед у чэсць Міністра Замежных Спраў Латвіі п. Мунтэрс.

На абедзе прысутнічалі суправаджаўшыя міністра Дырэктар Дэпартамента Міжнародных Дагавораў Міністэрства Замежных Спраў Латвіі п. А. Кампе, Чрэзвычайны Пасланнік і Паўнамоцны Міністр Латвіі п. Коціньш, Першы Сакратар п. Альберт. Ваенны атташэ п. Залітіс. Акрамя ўпамянутых асоб прысутнічалі т.т. І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, А. А. Жданоў, А. Ф. Горкін, В. П. Пронін, В. П. Пацёмкін, В. Г. Деканозаў, С. А. Лазоўскі, І. С. Зотаў, В. Я. Тэрэнцьеў, Р. П. Хмельніцкі, С. П. Казырэў, А. А. Соболеў, В. Н. Баркоў, А. П. Васюкоў, В. Г. Понтінаў.

У часе абеда т. В. М. Молатаў і п. Мунтэрс абмяняліся прывітальнымі прамовамі. Абед прайшоў у цёплай і дружаственай атмасфэры.

Ад'езд з Масквы Міністра Замежных спраў Латвіі п. Мунтэрса

5 кастрычніка г. г. з Масквы выехаў Міністр Замежных Спраў Латвіі п. Мунтэрс у суправаджэнні Дырэктара Дэпартамента Міжнародных Дагавораў п. А. Кампэ.

На Беларускім вакзале п. Мунтэрса праводзілі: Намеснік Народнага камісара Замежных Спраў тав. С. А. Лазоўскі, Нам. Старшыні Моссовета тав. М. А. Ясноў, поўпрэд СССР у Латвіі тав. І. Зотаў, торгпрэд СССР у Латвіі тав. В. Я. Тэрэнцьеў, Загадчык Пратакольным Аддзелам НКЗС тав. В. Н. Баркоў, Заг. Аддзелам Прыбалтыйскіх Дзяржаў тав. А. П. Васюкоў, камендант гор. Масквы комбрыг тав. В. А. Рэвякін, увесь састаў Латвійскай Місіі ў Маскве на чале з Чрэзвычайным пасланнікам і паўнамоцным міністрам п. Коціньш.

Беларускі вакзал быў упрыгожан совецкімі і латвійскімі флагамі. Для провадаў міністра быў выстаўлен пачотны караул.

АГУЛЬНАГАРАДСКІ СХОД НАСТАЎНІКАЎ Г. ВІЛЬНО

Аддамо усе нашы сілы і здольнасці на служэнне вызваленаму народу

Арганізуем работы школ па-новаму

Учора ў зале кінотэатра „Марс" адбыўся многалюдны агульны сход настаўнікаў горада. На сходзе прысутнічала каля 2 тыс. чалавек. На сцэне партрэты таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, прывітальныя лозунгі.

Упершыню адзінай брацкай сям'ёй адзін з вялікіх атрадаў народнай інтэлігенцыі — настаўнікі горада сабраліся для абмеркавання і вырашэння важнейшых пытанняў жыцця і работы школ па-новаму.

Знікла варожасць паміж настаўнікамі розных нацыянальнасцей, якая старанна культывіравалася польскай шляхтай. Сёння ўсе яны, вызваленыя ад пут нацыянальнага і соцыяльнага гнёту, сабраліся для таго, каб сумесна вырашыць важнейшае пытанне, як лепш арганізаваць сваю работу па арганізацыі справы народнай асветы на новых началах.

Пасля выбараў дзелавога прэзідыума і прыняцця абвесткі дня схода, з дакладам аб чарговых задачах настаўнікаў у галіне народнай асветы выступіў загадчык аддзела культуры і асветы Часовага Упраўлення тав. Клімаў. У змястоўным дакладзе тав. Клімаў падрабязна расказаў сабраўшымся аб вялікіх гістарычных падзеях у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, аб тым, з якой чэсцю і славай доблесная Чырвоная Армія вызваляе працоўных Заходняй Беларусі ад векавечнага гнёту польскіх паноў.

Совецкі народ ніколі не забываў сваіх інтэрнацыянальных абавязкаў аб аказанні брацкай дапамогі прыгнечаным і парабашчаным брацкім народам, — гаворыць тав. Клімаў. Усе мы з'яўляемся зараз жывымі сведкамі таго, як наша Чырвоная Армія змятае з твару зямлі Заходняй Беларусі ўсю нечысць польскай шляхты.

Парабашчаныя і вякамі прыгнятаемыя народы Заходняй Беларусі вызвалены з-пад іга польскіх паноў, памешчыкаў і капіталістаў нашай усепераможнай Чырвонай Арміяй. Гэта Армія давядзе сваю вялікую гістарычную місію вызваліцельніцы і да канца знішчыць лютых ворагаў працоўных Заходняй Беларусі.

Магутнасць совецкай дзяржавы і Чырвонай Арміі асновала на вялікай дружбе многанацыянальнага і многамільённага совецкага народа. Мы ўпэўнены, што працоўныя свабоднай Заходняй Беларусі таксама з'яднаюцца ў адзіную сям'ю брацкага саюза народаў і займуць у ёй пачэснае месца.

Бурнымі апладысментамі пакрываюцца гэтыя словы дакладчыка. Прысутныя выражаюць сваё аднадушнае жаданне работаць і жыць у сям'е вялікага Совецкага народа.

Дакладчык падрабязна заставіўся на практычных задачах калектыва настаўнікаў у справе пабудовы новай школы, на аснове навукі і інтарэсаў свабоднага народа.

Выкладанне ў школах павінна весціся на роднай мове вучняў,— гаворыць тав. Клімаў. Трэба рашуча вытравіць паланізацыю мовы, школы, якую 20 год насільна праводзілі польскія паны і даць магчымасць усім дзецям вучыцца на сваёй роднай мове.

Трэба зараз-жа перагледзіць і праграмы школ. Усё непатрэбнае, увесь хлам павінен быць выкінуты са школ і дзеці павінны атрымоўваць асвету па тыпу совецкіх школ. Многа прадстаіць работы настаўнікам. Часовае Упраўленне спадзяецца, што настаўнікі горада прымуць актыўны ўдзел у рабоце па стварэню новай школы, па навядзенню ў школах сапраўднага парадку.

Правазглашоныя дакладчыкам прывітанні ў чэсць Ленінска-Сталінскай нацыянальнай палітыкі, Комуністычнай партыі большэвікоў і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна пакрываюцца бурнымі апладысментамі ўсёй залы.

Пасля даклада і адказаў на заданыя пытанні, разгараецца ажыўлёныя спрэчкі. Адзін за другім на трыбуну многалюднага схода падымаюцца настаўнікі ўсіх узростаў і ўсіх нацыянальнасцей.

У прамовах выступаўшых гучэлі словы сардэчнай радасці за мудрую палітыку Совецкага Ўрада, за небывалы ў гісторыі такі знамянальны дзень, калі настаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, як родныя браты, сабраліся на свой сход для вырашэння важнейшых пытанняў. Сапраўды, гэты дзень знамянальны. Вечна паміж інтэлігенцыяй горада сеялася польскай шляхтай варожасць, нянавісць. А сёння яны роўныя між роўных на сваім сходзе!

Вось на трыбуне тав. Дугіль Н. Т. — дырэктар рускай гімназіі. Першыя словы яго звернуты да геранчай Чырвонай Арміі. Зал бурна апладыруе.

З вялікай ўвагай было выслухана выступленне беспрацоўнага настаўніка таварыша Путрамента Ю. Тав. Путрамент расказаў аб часах нечуваных здзекаў польскай шляхты над працоўнымі ўсіх нацыянальнасцей.

У кожнага чэснага працоўнага паляка сэрца сціскалася ад болю, гледзячы на тыя бесчалавечныя здзекі, якія чынілі польскія паны над працоўнымі ўсіх нацыянальнасцей. Гэтай несправядлівасці не бываць больш ніколі. Мы толькі з дапамогай Чырвонай Арміі, Совецкага Урада зажывём у дружбе, радасна і шчасліва.

З чарговай прамовай выступіў стары настаўнік тав. Маеўскі. Ён праклінаў тую чорную старонку гісторыі ў жыцці Заходняй Беларусі, калі тут гаспадарыла польская шляхта. Факты і прыклады траўлі і ненавісці да чалавека прыводзіў тав. Маеўскі ў пацвярджэнне той несправядлівасці, якая панавала ў Заходняй Беларусі ў працягу 20 год.

Тав. Маеўскі заклікаў настаўнікаў горада ўключыцца ў актыўную работу і будаваць новае, справядлівае жыццё, працоўных усіх нацыянальнасцей, будаваць новую школу.

На сходзе аднагалосна быў выбран прадстаўнік настаўнікаў горада ў арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы да Усенароднага схода працоўных Заходняй Беларусі тав. Путрамент Ю.

З вялікім пад'ёмам настаўнікі горада паслалі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну і таварышу Молатаву. У канцы схода была прынята рэзалюцыя.

А. Бур.

Масква, Крэмль

Таварышу СТАЛІНУ

Дарагі наш Іосіф Вісарыёнавіч!

У гэтыя радасныя для ўсяго шчаслівага народа свабоднай Заходняй Беларусі дні, калі з самай глыбіні сэрцаў усіх працоўных нясуцца словы ўдзячнасці за бацькоўскія Вашы клопаты аб нас, прыміце, наш дарагі бацька, прывітанне ад настаўнікаў горада Вільно. Мы бязмежна ўдзячны Вам за мудрае рашэнне Совецкага Ураду аб аказанні брацкай дапамогі працоўным Заходняй Беларусі ў цяжкія часы, калі ўсім нам пагражала разарэнне і пакуты.

Народ Заходняй Беларусі доўгія годы быў пад гнётам польскіх паноў. Над беларусамі і працоўнымі другіх нацыянальнасцей вечна здзекваліся паны і падпанкі, польская шляхта і чыноўнікі, урады панскай Польшчы.

Зараз для ўсіх нас заззяла сонца раднага і шчаслівага творчага жыцця. Раз і назаўсёды знішчан гнёт і парабашчэнне. Няма і не можа быць для працоўных Заходняй Беларусі большай радасці, чым жыць і работаць у дружнай вялікай сям'і Совецкага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Пад Вашым, таварыш Сталін, мудрым вадзіцельствам народы Совецкага Саюза дабіліся вялікіх сусветна-гістарычных перамог. З краіны адсталай і забітай СССР ператворан воляй Комуністычнай Партыі большэвікоў, усяго совецкага народа ў магутнейшую дзяржаву ва ўсім свеце. Мы рады і шчаслівы, што будзем жыць у гэтай сям'і, што будзем тварыць на блага працвітання радзімы соцыялізма.

Вялікая работа прадстаіць настаўнікам Заходняй Беларусі, каб пабудаваць новую школу. Мы запэўняем Вас, таварыш Сталін, што прыкладзем усе свае сілы, аддадзім усе свае веды і энергію на чэснае служэнне свабоднаму народу, на будаўніцтва новай школы. Сваёй адданай работай на фронце асветы мы будзем выхоўваць дзяцей у духу бяззаветнай любві і адданасці радзіме соцыялізма, Чырвонай Арміі, Совецкаму Ўраду.

Няхай жыве новая школа ў свабоднай Заходняй Беларусі!

Няхай жыве правадыр і настаўнік таварыш Сталін!

Таварышу Молатаву

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Прыміце ад нас, настаўнікаў горада Вільно, гарачае прывітанне і нашу бязмежную ўдзячнаць за мудрае рашэнне Совецкага Урада аб аказанні працоўным Заходняй Беларусі дапамогі ў вызваленні ад іга польскіх паноў.

Толькі Совецкі Урад, толькі такі мудры правадыр, як наш родны таварыш Сталін могуць так па-бацькаўску клапаціцца аб сваіх адзінакроўных братах-беларусах. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія краіны соцыялізма прышла к нам як вызваліцельніца і прынесла ўсім працоўным Заходняй Беларусі радасць і шчасце. Ніколі Беларускі народ не забудзе гэтай дапамогі і вечна будзе ўдзячны партыі Леніна-Сталіна, Совецкаму Ураду і Чырвонай Арміі за сваё вызваленне.

З вялікім хваляваннем мы слухалі па радыё Вашы мудрыя словы ў прамове 17 верасня. Слёзы радасці выступалі на тварах абяздоленага і прыгнечанага народа. З мінуты на мінуту чакалі мы прыходу сваёй роднай вызваліцельніцы — Чырвонай Арміі.

І вось Заходняя Беларусь стала свабоднай. Няма больш прыгнёту польскай шляхты, няма нацыянальнага парабашчэння. Працоўны народ стаў поўнапраўным гаспадаром свайго жыцця.

Воля і чаянні ўсіх радных па крыві працоўных беларусоў—з'яднацца ў адну сям'ю і жыць і тварыць у адзіным брацкім саюзе вялікага совецкага народа. Няхай нам роднай мацер'ю будзе Чырвоная Масква.

Настаўнікі горада Вільно поўнасцю далучаюцца да гэтага голасу працоўных мас Заходняй Беларусі і выказваюць сваю гатоўнасць, сваё жаданне не пакладаючы рук работаць на тое, каб мы хутчэй зажылі адзіным жыццём з народамі Совецкага Саюза.

Настаўнікі горада Вільно запэўняюць Совецкі Урад, што яны прыкладуць усе свае сілы, аддадуць свае веды і здольнасці на працвітанне вялікай дружбы народаў, на яшчэ большае ўмацаванне краіны соцыялізма. Будзем чэсна і аддана служыць вызваленнаму народу. Зробім асвету, навуку і культуру здабыткам шырокіх працоўных мас свабоднай Заходняй Беларусі.

Няхай жыве Совецкі Урад і яго глава таварыш Молатаў!

Няхай жыве гераічная Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

З рэзалюцыі агульнага схода настаўнікаў горада Вільно

Мы, настаўнікі школ пачатковых, прафесіянальных і сярэдніх навучальных устаноў і гімназій, сабраўшыся на свой агульнагарадскі сход, абмеркавалі радасныя для народаў Заходняй Беларусі падзеі. Разам са ўсімі працоўнымі свабоднай і шчаслівай Заходняй Беларусі мы горача вітаем нашу вызваліцельніцу — слаўную Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію, бязмежна ўдзячны вялікаму совецкаму народу за аказаную нам брацкую дапамогу.

Працоўныя Заходняй Беларусі стагналі пад векавечным ігам польскіх паноў. Беларусы, яўрэі, літоўцы, украінцы і другія нацыянальныя меншасці Польшчы былі пазбаўлены элементарных праў. Насільна і пад нечуваным прымусам праводзілася паланізацыя школы і мовы. Беларускія школы былі закрыты, газэты і кнігі на беларускай мове не выдаваліся.

Гэтыя путы рабства народы Заходняй Беларусі пры дапамозе Чырвонай Арміі скінулі з сябе раз і назаўсёды.

Мы ведаем, што толькі пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі народы вялікага Совецкага Саюза развіваюць сваю нацыянальную культуру. Толькі ў брацкай сям'і народаў СССР і беларускі народ Совецкай Соцыялістычнай Беларусі, роўны сярод роўных, атрымаў магчымасць развіваць сваю культуру, асвету, мастацтва — нацыянальнае па форме і інтэрнацыянальна-соцыялістычнае па зместу.

Мы выканаем сваё аднадушнае жаданне аддаць усе нашы сілы і здольнасці на служэнне вызваленнаму народу, на будаўніцтва новай школы.

Нашы задачы ў будаўніцтве новай школы састаяць у тым, каб пачаць работу школ па тыпу совецкай школы. Для гэтага мы пачнем шырокую масовую работу з вучнямі і іх бацькамі. Па школах будзем праводзіць бацькоўскія сходы і наладзім сістэматычную сувязь з бацькамі.

Настаўнікі горада Вільно выказваюць сваю цвёрдую упэўненасць у тым, што ў бліжэйшы час у нас будзе пабудавана новая школа, на аснове навуковых праграм, на аснове інтарэсаў вызваленага народа Заходняй Беларусі. Агульны сход настаўнікаў звярачаецца з просьбай да Часовага Управлення аб арганізацыі ў горадзе адзінага прафесіянальнага саюза настаўнікаў.

Сялянскія камітэты за работай

Браслаў

Вялікую і цікавую работу праводзіць Браслаўскае Часовае Упраўленне. Актыўна работаюць тут сялянскія камітэты.

Старшыня сялянскага камітэта Грышанскай воласці тав. Пятроўскі расказаў аб тым, што 40 сялянскіх гаспадарак падзялілі зямлю, якая знаходзілася ў 3 маёнтках, атрымалі рабочую жывёлу.

Звыш 200 сялян воласці атрымалі дровы для паліва.

— У Перабродскай воласці, — гаворыць старшыня сялянскага камітэта тав. Казлоўскі, сяляне падзялілі паміж сабой зямлю маёнтка Забалоцце.

У Богінскай воласці сяляне падзялілі паміж сабой зямлю, якая належыла раней маёнтку Палонск. 20 гаспадарак раздзялілі паміж сабой 100 га у сярэднім па гектару на душу. Млын, які належаў графу Плятэру, перайшоў у рукі сялянскіх камітэтаў. На млыне работа праходзіць бесперабойна. Адказвае за работу ў млыне рабочы Мачыш Пётр. Сяляне воласці атрымліваюць страявы лес на пабудову хат і іншых будынкаў.

Большасць школ воласці прыступіла да заняткаў. Камітэт выкарыстоўвае ў якасці настаўнікаў людзей, якія скончылі раней рускія і беларускія гімназіі.

Аб цікавых справах работы сялянскіх камітэтаў Відзкай воласці разказаў тав. Воранаў. Ужо раздзелена 7 памешчыцкіх маёнткаў. Шмат сялян, якія раней зусім не мелі зямлі, ці мелі яе нямнога цяпер атрымалі па 5—10 га.

Безлашадныя гаспадаркі атрымалі па каню, а бескароўныя — па карове. Па ініцыятыве сялянскіх камітэтаў праведзена нарада настаўнікаў воласці. Вучоба праходзіць ва ўсіх школах нармальна.

На педагагічную работу накіравана больш 40 таварышоў. У м. Відзах арганізаваны курсы па вывучэнню рускай і яўрэйскай моў.

Камітэт адпусціў адпаведныя будаўнічыя матэрыялы для рамонту лазні.

Вядзецца работа па наладжанню рэволюцыйнага парадку.

Х. Батвінік.

Варняны

У вёсках і мястэчках Варнянскай воласці Віленска-Трокскага уезда адбываюцца мнагалюдныя сходы сялян. На сходах сяляне выбіраюць свае органы ўлады — сялянскія камітэты. Па воласці ўжо выбраны 7 сялянскіх камітэтаў.

Большасць сялянскіх камітэтаў прыступілі да работы. З дапамогай камітэтаў сяляне дзеляць памешчыцкія землі і маёмасць з памешчыцкіх маёнткаў. Уся гэта работа праходзіць пад кіраўніцтвам сялянскіх камітэтаў.

Па Варнянскай воласці раздзелена зямля памешчыкаў 7 маёнткаў. Каля 1300 гаворнай зямлі атрымалі ў сваё карыстанне сяляне вёсак і батракі маёнткаў.

Арганізавана праводзіцца камітэтамі падзел інвентара і жывёлы. З маёнтка Дубінкі сяляне вакалічных вёсак атрымалі 20 коней і 68 кароў. Усяго з маёнткаў сяляне атрымалі 50 рабочых коней і 162 дойных кароў. Жывёла забяспечваецца кармамі на стойлавы перыяд

Паставы

Сялянскія камітэты амаль закончылі падзел памешчыцкіх зямель, закончылі ўборку бульбы і прыступілі к малацьбе збожжа. Сялянскія камітэты прыступілі к забеспячэнню сялян, якія маюць патрэбу ў дровах. Арганізаваны пункты медыцынскай дапамогі. На днях адбылася нарада сялянскіх камітэтаў, якая разгледзела некаторыя пытанні, як падзел памешчыцкай зямлі, работа грамадзянскай міліцыі, лясное пытанне і гандаль, і вызначыла далейшыя задачы работы сялянскіх камітэтаў.

Маюцца два рабочыя камітэты: у Паставах і Варапаеве. Пастаўскі камітэт праводзіць будаўнічую работу. З канчваецца пабудова гімназіі, народнай школы, рамонт бальніцы і пабудова пральнай фабрыкі. Пабуловай фабрыкі кіруюць самі рабочыя.

У Варапаеве ёсць лесапрамысловы завод. На нарадзе рабочага камітэта было прынята рашэнне аб пуску яго. Праводзіцца загатоўка драўніны і работа ў майстэрнях.

Рабочы камітэт лесапрамысловага завода звярнуўся к сялянам. каб яны давалі заказы па старых цэнах.

Катовіч—член Часовага Упраўлення

Пастаянны тэатр рускай драмы ў Вільно

Першыя пастаноўкі „Без вины виноватые“ Остроўскага і „На дне“ Горкага.

Па ініцыятыве групы віленскіх тэатральных работнікаў, з прыходам у Вільно часцей Чырвонай Арміі, быў арганізаван калектыў „Тэатра рускай драмы ў Вільно“.

Вільно—горад рускай тэатральнай традыцыі, даўшай рускаму тэатру Качалава, за час польскага ўладарніцтва быў пазбаўлен рускага тэатра.

Жыццё рускіх артыстаў, якія апынуліся „за рубяжом“ ад тэатральнай рускай сцэны, было далёка незавідным. Некаторыя з рускіх артыстаў былі сілком переведзены на польскую сцэну. Тэатральныя пастаноўкі на рускай мове былі з'явішчам вельмі рэдкім. Цяпер стан вішча змянілася карэнным чынам.

Артысты рускай сцэны ўздыхнулі поўнай грудзяю. Перад імі адкрыліся новыя перспектывы, вялікія творчыя магчымасці.

Член калектыва, артыст і адміністратар „Тэатра рускай драмы ў Вільно“, Сергей Орліч расказвае:

— Гэта будзе пастаянны рускі тэатр у Вільно. Наш калектыў складаецца з 15 прафесіянальных артыстаў. Рэжысёрам з'яўляецца артыст Владыслаў Чэнгеры, знаёмы віленскай публіцы па яго гастрольным выступленням у Вільно ў якасці артыста-рэжысёра „Тэатра рускай драмы ў Рыге“ і па яго рэжысёрскай дзейнасці ў Віленскім польскім гарадскім тэатры.

Сапраўднымі членамі калектыва з'яўляюцца артысты: Юлія Івіна, Орлоў, Александр Вронскі, Сергей Орліч, Нікалай Ігнацьеў, Еўгенія Канстанцінаўна Інлой, Опрышчанко, Рыхцер, Шаўцова-Опрышчанка і Зоя Тамашэўская. Акрамя гэтага тэатр распалагае кадрамі любіцелей і любіцельніц, якія будуць выконваць эпізадычныя і статыстычныя ролі.

Калектыў тэатра прыступіў ужо к рабоце. Рыхтуюцца да пастаноўкі дзве п'есы класычнага рэпертуара рускай драматургіі: „Без вины виноватые“ і „На дне“. У далейшым тэатр мяркуе ставіць п'есы сучаснай совецкай драматургіі.

Тэатр будзе праводзіць сваю работу і ў другіх гарадах, мястэчках і сёлах Заходняй Беларусі.

Новаму мастацкаму прадпрыемству жадаем поспеха і пладатворнай дзейнасці на карысць народаў Заходняй Беларусі.

Х. Ю.

ЯНКА КУПАЛА

На заходне-беларускія матывы

Ой, павей, вецер!...

Толькі йшчэ ўчора, не далей
Сярод малітваў, кляцьбы
Гэткія песні складалі,
Песні нуды і журбы:

Ой, павей, вецер з Усходу
Вестачку нам прынясі,
Як там жывецца народу,
Хто колькі зжаў, накасіў.

Ой, павей, вецер саколік,
Хай там пачуюць яны,
Як мы цярпім у няволі,
Як нас катуюць паны.

Ой, павей, вецер, нам мілы,
Голас ім твой хай спяе,
Як мы без часу ў магілы
Косці складаем свае.

Ой, павей, вецер, над гаем,
Хай прыдуць ночкай, ці днём
Кветкамі іх прывітаем,
З руты вянкі ім спляцём.

Накарміліся панскаю ласкай...

Накарміліся панскаю ласкай,
Горкіх слёз напіліся дасыта,
Што здавалася ўчора йшчэ казкай,
Прышло сёння, у сонца спавітым.

Расплываліся ў небе туманы,
Разганяў вецер ссохшае лісце,
Салавейка спяваў над курганам,
Неяк быццам спяваў галасісцей.

Ішлі гоманы нівай наспелай,
Гарады аклікаючы й вёскі,
Белавежская пушча шумела
І шумеў цёмны лес Аўгустоўскі.

Пераклікі чуваць былі ў хвалях
Паміж Нёманам, Днепрам і Бугам
І да Волгі плылі, дабягалі
Шэпта хваляў ад Нёмана друга.

Перад намі за панскай стражніцай,
За слупамі з арламі, а блізка,
Новы свет развідняўся зарніцай,—
Долі, волі народнай калыска.

Мы лавілі і думкай і вухам
Стуль найменшае водгулле-рэха,
Вораг толькі стуль вестак не слухаў,
Упіваўся раз'юшаным смехам.

Выглядалі, чакалі цярпліва,
Як чакае з вайны маці сына,
Той хвіліны чароўнай, шчаслівай,
Калі прыдуць з вялікай навінай.

І прышоў гэты час перамогі,
Вярнігорай прышоў ён з усходу
І руйнуе кайданы, астрогі,
На свабоду выводзіць народы.

Накарміліся панскаю ласкай,
Горкіх слёз напіліся дасыта:
Што здавалася ўчора йшчэ казкай,
Прышло сёння, у сонцы спавітым.

Ты мне песню спей, дзяўчына...

Ты мне песню спей, дзяўчына,
Як у пана ты служыла,
Чаму смутна, бедачына,
Накрыж ручанькі зложыла?

Уставала рана,
Лажылася позна,
І ў сне чула панаў
Голас хрыплы, грозны.

З горкай, цяжкай долі,
У пякельнай нетры,
Як былінка ў полі,
Гнулася ад ветру.

Ты мне песню спей, дзяўчына,
Як ты пану жыта жала,
Як згібала крукам спіну
І аб чым тады спявала?

Ой, цяжка дзяўчыне
Жаць поле чужое,
На марнае гіне
Жыццё маладое!

Ой, цяжка днём ночай
Рабіці на пана,
Ліць слёзы дзявочы
Ад рана да рана.

Ты мне песню спей, дзяўчына,
Як цябе за тваю працу
На бадзянне сірацінай
Выгнаў пан зімой з палацу?
Ты мне спей!...

Калыханка

Спі, мой маленькі сыночак,
Спі, мая дзетка, засні!
Многа з табою мы ночак
Спаць не заснулі ані.

Недзе ў астрозе твой татка,
Ў панскім астрозе гніе...
Ціха, не плач, дзіцянятка
Вочкі заплюшчы свае!

* * *

Спі, мой сыночак, мой родны,
Будзеш расці ў новы час!
Чуеш, як ветрык свабодны
Шчасцейкам вее на нас.

Ведаць не будзеш няволі,
Панскіх кайдан, бізуноў,
Панскай не будзеш ніколі
Служкай, сыночак ты мой.

* * *

Спі мой сыночак! Лёс горкі
Больш не кране ў барацьбе,
Зоркі, Крэмлёўскія зоркі
Будуць свяціці табе.

Жудкіх не зведаеш ночак,
Блукаць не будзеш нідзе,
Долю тваю, мой сыночак,
Сталін да сонца ўзвядзе.

Расшумеўся лес зялёны...

Расшумеўся лес зялёны
Ад шчаслівых новых дзён,
Слава Арміі Чырвонай!
Варашылаву паклон!

Скінуў з плеч няволю Нёман,
Усміхаецца Вілля.
І з-пад Буга плыве гоман,
Весяліцца ўся зямля.

Уцякаюць панкі-ляхі,
Бы з пажару пацукі,
Пана ў процьму гоняць страхі,
Смела ходзяць бednякі.

Ўжо ад мора і да мора
Пан не строіць сабе меж,
Бо нядаўна, толькі ўчора
Які меў, згубіў рубеж.

Уцякаюць, дзе папала,
І ўцякаць няма куды,
Пазбываемся навалы,
Панскай подлай злыбяды.

Паўстае народ рабочы,
Паўстае сялянскі люд;
Развідняе сонца ночы,
Нібы казка, нібы цуд.

Песняй гулкай міліёнаў
Ў сэрцы ўдарым, нібы ў звон
Слава Арміі Чырвонай!
Варашылаву паклон!

Ерэван—Мінск.

Верасень. 1939 г.

Вільно спявае совецкія песні

З 13 кастрычніка г. г. радыёстанцыя ім. Комінтэрна, прысвеціць спецыяльныя радыё-перадачы для разучвання совецкіх песень працоўнымі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Працоўныя горада Вільно з радасцю ўспрынялі гэта паведамленне. Вільно любіць і цэніць совецкія песні.

Яшчэ ў эпоху панскага гнёту ўсё Вільно ведала на памяць і пела тайком выдатныя песні з паказанага тут, у выглядзе выключэння, совецкага фільма „Веселые ребята“.

Цяпер працоўныя Вільно ведаюць ужо і „Каховку“, і „Масква мая“ і іншыя выдатныя песні совецкага народа.

* * *

Без чверці 8. Грамадзяне спяшаюць разыйсціся па дамам. На вуглу Трокскай і Завальнай вуліцы, паблізу так званых „болванов Тышкевіча“ грузавы аўтамабіль з чырвонаармейцамі. Кругом аўтамабіля натоўп. Якісці бойкі хлапец зварочваецца да чырвонаармейцаў:

— Праспявайце, таварышы, совецкую песню. Мы так доўга чакалі гэтай магчымасці.

Вочы хлапчука з бязмежнай даверлівасцю накіраваны на чырвонаармейцаў. Так магчыма глядзець толькі на прадстаўнікоў сваёй, народнай Рабоча-Сялянскай Арміі. Чырвонаармейцы не могуць адказаць. Шырокай хваляй льецца па Трокскай вуліцы совецкая шчаслівая песня, апавядаючая аб зусім іншым, прыгожым жыцці, якога працоўныя горада Вільно да гэтай пары не ведалі.

* * *

Вузкая чэлюсць Рудніцкай вуліцы напаўняецца раптам гукамі Чырвонаармейскай песні. Гэта спяваюць спяшаючыя кудысьці на аўтамабілі чырвоныя байцы. Праходзячыя ветліва падымаюць рукі, а многія з іх падхапліваюць голасна мелодыю і спяваюць сумесна з байцамі.

* * *

На Антокальскай вуліцы група дзяцей акружыла байца.

— Навучыце нас, таварыш, совецкім песням. Мы жадаем іх спяваць у гадавіну Вялікай Кастрычнікавай Рэволюцыі.

Баец спявае і дзеці старанна і ўважліва ўтораць яму.

* * *

Вільно любіць і спявае совецкія песні.

Совецкія паштовыя маркі ў Вільно

Гэтымі днямі ў віленскіх і правінцыяльных паштовых установах з'явяцца ў продажы совецкія паштовыя маркі.

З з'яўленнем гэтых марак будзе наладжана нармальная паштовая сувязь паміж Заходняй Беларусіяй і СССР.

Польскія паштовыя маркі будуць неадкладна із'яты з карыстання.

Наладжана ўжо нармальная паштовая сувязь паміж Вільно і ўсімі другімі паштовымі канторамі вызваленай Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

„Прекрасная Елена“ у тэатры „Лютня“

Польскі тэатр оперэты „Лютня“ падрыхтаваў да пастаноўкі класічную оперэту Офенбаха „Прекрасная Елена“.

Пашырэнне батанічнай лабараторыі

На Завальнай вуліцы, вугал Малай Пагулянкі, знаходзіцца гарадская школьная батанічная лабараторыя.

Акруговым тэхнічным аддзелам пры Часовым Упраўленні вядуцца цяпер работы па пашырэнню памяшкання гэтай лабараторыі, якая будзе аддана ў распараджэнне ўсіх існуючых у Вільно школ.

Да лабараторыі дабудоўваюцца дзве новыя залы.

Мінск — сталіца Совецкай Беларусі

„Квартал за кварталам растуць камяніцы
Былое правінцыі гінуць сляды,
Наш Мінск стаў сапраўднай культурнай сталіцай
Растуць у рэспубліцы ўсе гарады“.

(З пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну).

Сталіца ордэнаноснай БССР — гор. Мінск — шырока раскінулася сярод узгоркаў і раўнін абодвух берагоў ракі Свіслач. Пры набліжэнні да горада яшчэ здалёку разгортваецца панарама заводскіх карпусоў, высокіх будынкаў на чале з прыгажуном—Домам урада.

Мінск — старажытны беларускі горад. Першыя летапісныя весткі аб ім адносяцца да палавіны XI стагоддзя. Паддзеі на рацэ Нямізе ярка апісаны ў „Слове аб палку Ігараве“. „На Нямізе снопы сцелюць галавамі... пасеяны касцьмі рускіх сыноў“.

На працягу ўсёй сваёй шматвяковай гісторыі горад многа раз падвяргаўся нападам. Яго грабілі шведы, палякі, французы.

Польскія магнаты, імкнучыся падняволіць беларусоў, далучылі і Мінск па Люблінскай уніі ў 1569 годзе да польска-літоўскай дзяржавы. Але беларускі народ упорна не паддаваўся польскаму ўплыву. Ён вёў нацыянальна-вызваленчую вайну супроць паноў і намешчыкаў, супроць каталіцкага духавенства.

Беларускі народ быў заўсёды цесна звязан з рускім народам як блізасцю мовы, так і бытавымі ўкладам і звычаямі. Разам з рускім народам ён змагаўся з палякамі, энергічна ваяваў у 1812 годзе з французамі.

З 1796 года Мінск становіцца губернскім горадам царскай Расіі. Размешчаны на тэрыторыі прыгнечанай царскім урадам нацыянальнай акраіны, Мінск адлюстроўваў чарты адсталай эканомікі края. Невялікі губернскі горад, горад „чарты яўрэйскай аседласці“, купцоў, гандляроў, дробных рамеснікаў і велізарнай масы беднаты, налічваў у 1856 годзе ўсяго 24 тысячы жыхароў. У 1871—1873 гг. праз Мінск праводзяцца дзве чыгункі: Маскоўска-Брэсцкая і Лібава-Роменская. Праз Мінск ідзе хлеб з Украіны на заграмічныя рынкі, дровы і лес на поўдзень — у Крэменчуг, Екацерынаслаўль, Одэсу. З Захада на Маскву праз Мінск ідуць металічныя вырабы, розныя сарты пражы, тканіны і т. д.

Насельніцтва пачынае расці. У 1897 годзе — 84,2 тысячы чалавек, у 1912 годзе—104 тысячы чалавек. Але колькі-небудзь буйнай прамысловасці горад не меў: прадпрыемствы былі дробныя, поўсаматужнага тыпу. Самымі „буйнымі“ прадпрыемствамі з'яўляліся завод „Метал“, на якім працавала 209 рабочых і служашчых, і фабрыка па выпрацоўцы грэбняў з 104 рабочымі. На астатніх прадпрыемствах колькасць рабочых не перавышала 20—30 чалавек.

Вуліцы Мінска, яго плошчы, ускраіны—нямыя сведкі гераічнай барацьбы пролетарыяў горада з самадзяржаўем і з белапольскімі акупантамі.

Рабочы рух пачаўся тут яшчэ ў канцы 80 гадоў. У 1884 годзе адбываліся буйныя канфлікты рабочых з прадпрыемцамі, а ў наступным годзе—першыя забастоўкі. У гэты час у Мінску ўзніклі марксісцкія гурткі сярод навучаючайся моладзі і рамесных рабочых. Мінскія соцыял-дэмакраты ўстанавілі сувязь з Масквой і іншымі гарадамі Расіі. 1 — 3 сакавіка 1898 года ў Мінску адбыўся першы з'езд РСДРП.

Кастрычнік 1905 года. Мінскія рабочыя дружна далучыліся да ўсеагульнай стачкі, ахваціўшай усю Расію. Кровожадны губернатар Курлоў учыняе дзікую расправу над масамі працоўных, якія сабраліся на мітынг ля прывакзальнай плошчы. Плошча абагрылася крывёю многіх забітых і раненых. Курлоў атрымлівае царскую падзяку — становіцца таварышам міністра ўнутраных спраў.

1914 год. Імперыялістычная вайна. Горад знаходзіцца ў прыфронтавай паласе, дзе канцэнтруюцца значныя армейскія часці. Скарыстоўваючы гэту акалічнасць, большэвікі разгарнулі актыўную рэволюцыйную прапаганду ў войсках. У Мінску працавалі тады тт. Фрунзе (Міхайлаў) і Мяснікоў.

На пасяджэннях ЦК нашай партыі напярэдадні Кастрычніка Мінск упамінаецца, як актыўны рэволюцыйны цэнтр. Рыхтуючы масы да паўстання, Ленін гаварыў: „...Абласны з'езд і прапановы з Мінска трэба скарыстаць для пачатку рашучых дзеянняў“.

1918 год. У горад уварваліся войскі германскага кайзера. Мінск акупіраван немцамі. Беларускія нацдэмы рабалепна прэкланяліся перад кайзераўскім ботам, пасылалі Вільгельму ліслівыя тэлеграмы. Большэвікі ўшлі ў падполле.

1919 год. Жахам сярэдневяковья авеян быў гэты год. Забойствы, здзекі і насілле над мірнымі жыхарамі. Цёмная ноч сярод белага дня — такая карціна Мінска ў часе прабывання белапалякаў у горадзе. Польскія жандары, афіцэры, панскія сыны шнырылі з нагайкамі па вуліцы, катавалі безабаронных грамадзян, білі і здзекваліся над насельніцтвам. Гэтыя нікчэмныя трусы, паразіты і дрэнныя воіны аказаліся спецыялістамі па насіллю, лоўка „брылі“ бароды старым яўрэям, з шчодрасцю апускалі аплявухі і беларусам і рускім.

У дні белапольскай акупацыі горад літаральна стагнаў. Пры адступленні белапалякі падпалілі Мінск з ўсіх бакоў. Гарэў вакзал, хлебапякарні, дамы. 11 ліпеня 1920 года Чырвоная Армія прагнала белапалякаў з Мінска, і горад быў канчаткова і назаўсёды вызвален ад інтэрвентаў.

Там, дзе зараз высяцца велізарныя жылыя будынкі і заводскія карпусы, заставаліся тады абгарэлыя руіны, груды каменняў, агаленыя балкі разбураных будынкаў, ізрытыя тратуары.

* * *

Наступілі годы мірнага будаўніцтва. Горад пачынае залечваць раны, нанесеныя белапалякамі. Ён ажывае, расце.

Новы Мінск перш за ўсё горад прамысловы з колькасцю рабочых больш 30 тысяч чалавек. У горадзе ёсць многа буйных, добра абсталяваных прамысловых прадпрыемстваў.

Станкабудаўнічыя заводы імені Варашылава і імені Кірава выпускаюць станкі для соцыялістычнай індустрыі і на экспарт. Хіба можна параўнаць невялікі поўсаматужны заводзік Якабсона і Ліўшыца з цяперашнім станкабудаўнічым заводам імені Кірава, які ў 1938 годзе выпусціў складаных станкоў на 13.5 мільёна рублёў. Да гэтага завода, да яго рэканструкцыі як нельга лепш адносяцца меткія словы тав. Л. М. Кагановіча „да старога гузіка прышылі новае паліто“.

У Мінску значная скурабутковая прамысловасць. Завод „Большэвік“ з'яўляецца спецыялізаваным заводам па выпрацоўцы хромавых

(Працяг на 4 стр.)

Як адбывалі катаргу

26 верасня г. г. з Картуз-бярозаўскага канцантрацыйнага лягера звярнуўся член бышага польскага сената Вячэслаў Багдановіч. У гутарцы з нашым карэспандэнтам ён расказаў наступнае:

— 1 верасня гэтага года мяне арыштавалі, прычын на гэта не ве-



даю. Думаю, за тое, што я беларус, ды яшчэ ўсходняй арыентацыі. У лукішскай турме мне было ўручана так званае „ожэченне", дзе толькі гаварылася, што я інтэрніраван на тры месяцы.

Спачатку мяне сумесна з іншымі трымалі ў „цэнтральным арыштце", дзе білі і здзекваліся. Там я сустрэўся з быўшым дырэктарам беларускай гімназіі Анцукевічам і інш. Праз чатыры дні нас перавялі на Лукішкі. 8-га нас цэлай партыяй віленцаў (124 чалавекі, з іх 25 жанчын) перавялі ў Картуз-бярозу.

Дзевяць дзён мучыліся мы там. Гэта была сапраўдная катарга. Усё, што я бачыў і перацярпеў за гэты кароткі час дала мне яскравы вобраз сапраўднага твару Польшчы. Можна было адразу зразумець, чаму так хутка развалілася дзяржава з 35 мільёнамі насельніцтва. Польшча не мела ўстойлівага тыла. Яна зрабіла ўсё, каб выклікаць не толькі нянавісць да сябе ў нацменшасцей, якіх было да 40 процантаў, а нават і ва ўсіх палякаў.

Аб рэжыму. Катарга нам была не ў рабоце. Ніякай працы там не было. Наадварот там усё пабудована на бессэнсоўнасці таго, што робіш. Там кожнага ганялі ў дзень па 12 гадзін. Словы „падні" і „устань" і зараз яшчэ гучаць у маіх вушах. Цяжка расказаць пра тыя здзекі, якія былі над намі. На дзень давалі толькі 100 грам хлеба і два разы пахлёбку, дзе крупіна даганяе крупіну часта ў бруднай пасудзе. За правіннасць і без правіннасці збівалі гумавымі палкамі.

Наканец нам удалося вырвацца. Начальства наша ўцякло з 17 на 8 верасня, пачуўшы, што немцы ўзялі Кобрын (за 54 км.), а совецкія войскі ідуць на Баранавічы (за 110 км.). Мы пра гэта нічога не ведалі і для нас было гэта неспадзявана. Ключы яны пакінулі бурмістру мястэчка. Адразу 7000 заключоных сталі свабоднымі. Віленская група рашыла ісці на бліжэйшую станцыю Кобрын, бо на Баранавічы не ішоў цягнік. Ад гэтуль немцы нас адвезлі ў Брэст. Брэст быў заняты 22 верасня і мы атрымалі магчымасць дабрацца да Баранавіч, а адтуль у Вільно. Цяпер я ажыў і убачыў іншы свет.

—:::—

Медыцынскія пункты ў вёсках Заходняй Беларусі

МАЛАДЗЕЧНА (Заходняя Беларусь. На 91 тысячу насельніцтва маладзечынскага ўезда існавала толькі адна больніца на 30 коек. Сялянам прыходзілася ехаць за дзесяткі кіламетраў у ўездны горад, але і там патрэбнай медыцынскай дапамогі яны не атрымоўвалі. Па рашэнню Часовага Упраўлення для лепшага абслугоўвання насельніцтва ў больніцы адкрываюцца два новыя аддзяленні — для рожаніц на 15 коек і дзіцячае аддзяленне на 15 коек.

Арганізуецца рад медыцынскіх пунктаў у вёсках. У доме былой памешчыцы адкрываецца больніца на 30 коек. Яна будзе абслугоўваць сялян Лебедзеўскай, Бенінскай і Палачанскай валасцей. У чатырох валасцях павета адкрываюцца ўрачэбныя пункты. Для іх падабраны памяшканні.

У вельмі цяжкіх умовах знаходзіліся многія школы павета. Заняткі праводзіліся ў маленькіх цесных памяшканнях, у хатах сялян. Па рашэнню Часовага Упраўлення многія школы будуць пераведзены ў астаўленыя памешчыкамі дамы. Сялянскія камітэты прымаюць меры да забеспячэння на зіму школ палівам.

Для лепшага забеспячэння насельніцтва Маладзечны палівам у горадзе адкрыт склад прадажы дроў. (Бел ТА.).

Мінск — сталіца Совецкай Беларусі

(Канец. Пачатак глядзі на 3 стр.)

скур. Абутковая фабрыка імені Кагановіча абрасла новымі велізарнымі цэхамі. Замест саматужных майстэрняў створана магутная швейная прамысловасць. Ёсць рад буйных прадпрыемстваў харчовай прамысловасці: хлебазаводы, мясакамбінат, птушкакамбінат і кандыцерская фабрыка „Комунарка", якая па абсталяванню і механізацыі стаіць у першых радах харчовых прадпрыемстваў Саюза.

Мінск — горад культуры. У ім — 45 школ з колькасцю вучняў звыш 30 тысяч выкладчыкаў звыш 1000 чалавек. Для шчаслівых совецкіх дзяцей пабудаван Палац піонераў. Гэты адзеланы пад граніт стройны трохпавярховы будынак выступае ўперад манументальнай каланадай.

У Мінску ёсць Акадэмія навук 12 вышэйшых навучальных устаноў, 22 тэхнікумы і 12 школ фабрычна-заводскага вучнёўства. У Мінску ёсць Вялікі тэатр оперы і балета, Беларускі драматычны тэатр, Яўрэйскі тэатр, Тэатр юнага гледача і Дзяржаўная філармонія. Пабудаван Клінічны гарадок з радам клінік, адкрыта многа амбулаторый, радзільных дамоў, дзіцячых яслаў і дзіцячых садоў.

Да рэвалюцыі газеты і журналы былі раскошшу, даступнай нямногім. Цяпер сталіца атрымлівае звыш 22 мільёнаў экземпляраў газет і журналаў у год. У горадзе знішчана непісьменнасць, быстра ліквідуецца і малапісьменнасць. Бібліятэка імені Леніна — трэцяя ў Саюзе па колькасці кніг.

Мінск — упарадкаваны социялістычны горад. Ён упрыгожваецца выдатнымі будынкамі, якія зусім змянілі яго аблічча. Уздоўж магістралі Барысаўскага тракта пабудаваны корпусы Акадэміі навук, Клінічнага гарадка, Політэхнічнага інстытута, Дома друку. У цэнтры горада ўзвышаецца велізарны адзінаццаціпавярховы будынак — Дом урада. Перад Домам — выдатнейшы помнік вялікага Леніна. Насупроць — комплекс будынкаў Універсітэцкага гарадка, а далей — новы прыгожы будынак гасцініцы „Совецкая Беларусь". Дом Чырвонай Арміі ў Мінску з'яўляецца адным з лепшых у Саюзе па прыгожасці афармлення і абсталявання.

Замест старой конкі з 1929 года ў горадзе ходзіць трамвай. З 1930 года функцыяніруе і расшыраецца каналізацыя. Павялічваецца сетка электраасвятлення, асфальтыруюцца вуліцы. Праведзена вялікая работа па азеляненню горада: у Мінску 14 паркаў, скверы і садоў. Зялёнае кальцо вакол горада складае звыш 1800 гектараў.

Совецкі Мінск стаў палітычным, культурным і індустрыяльным цэнтрам ордэнаноснай БССР, узорнай сталіцай з насельніцтвам 250 тысяч чалавек.

Новы Мінск — гэта яркае выражэнне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, бальшавіцкага размаху культуры, сталінскіх клопатаў аб самым каштоўным капітале — аб людзях.

Б. Ліберман.

ЗА РУБЯЖОМ

Пражаская газета аб совецка-германскіх адносінах

ПРАГА, 5 кастрычніка. (ТАСС). Пражаская газета „Нашы справы" ў нумары ад 4 кастрычніка змяшчае перадавы артыкул пад загалоўкам „Историческая века" прысвечаны совецка-германскім адносінам. Газета адзначае, што заключаны 28 верасня ў Маскве германа-совецкі дагавор аб дружбе — гэта „сур'ёзнейшая гістарычная века", газета ацэньвае гэты дагавор, як далейшы лагічны шаг пасля пакта аб ненападзе паміж Германіяй і СССР, пакончыўшы з спробамі Англіі і Францыі ўцягнуць Совецкі Саюз у вайну з Германіяй. „Совецкі Саюз і Германія, — піша газета, — прышлі к выв ду, што паміж імі няма спорных пытанняў і што яны, не гледзячы на рознасць палітычных рэжымаў, могуць супрацоўнічаць на карысць абедзьвух дзяржаў".

—:::—

Інтарэс па Совецкай літаратуры ў Эстоніі.

ТАЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). З кожным днём расце інтарэс працоўных Эстоніі к Совецкаму Саюзу. Павышаны інтарэс к жыццю ў СССР магчыма наглядаць усюды. У талінскім кніжным магазіне „Тэоколь" адзначаецца грамадныя патрабаванні на совецкую літаратуру. Супрацоўнікі магазінаў расказваюць, што штодзённа паступае дзесяткі заяў ад эстонскіх грамадзян, жадаючых падпісацца на совецкія газеты і журналы. Рэзка павялічалася прадажа совецкіх кніг. Многа жадаючых набыць кнігі аб дзяржаўнам устройстве, гандлю, эканоміцы СССР і асабліва „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)".

Цяга к вывучэнню рускай мовы вялікая. Дарослае насельніцтва патрабуе падручнікаў па рускай мове.

—:::—

Агенцтва „Гавас" аб дакладзе Далад'е

БРУСЕЛЬ, 5 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва „Гавас" передае, што з афіцыяльных крыніц не наступіла ніякіх вестак аб змесце даклада Далад'е на апошнім паседжанні совета міністраў. Аднак вядома, што Далад'е зрабіў агляд усялякіх фаз ваенных аперацый, а таксама дыпламатычнай дзейнасці, разгарнуўшайся за апошні тыдзень у выніку заключэння новага дагавора паміж Германіяй і СССР. Далад'е падкрэсліў значэнне ўчарашняй заявы Чэмберлена ў палаце абшчын аб пазіцыі, занятай англійскім урадам у адносінах да магчымых прапаноў міра. З пункту гледжання дыпламатычнага, так сама, як і ваеннага, фінансавага і эканамічнага, франка-англійская салідарнасць прадаўжае існаваць. Зразумела, пазіцыя гэтых дзяржаў будзе сагласована, калі ажыццёвіцца магчымасць канкрэтных мірных прапаноў. Далад'е пакінуў за сабою права зрабіць публічную заяву вечарам на паседжанні камісіі па замежным справам палаты дэпутатаў.

—:::—

Расходы Японіі на вайну з Кітаем

У верасноўым номеры англійскага журнала „Грет Брытен энд Іст" апублікованы даныя аб японскіх расходах за два гады вайны ў Кітаі. Ад 7 ліпня 1937 года да 7 ліпня 1939 года Японія зрасходавала на вайну ў Кітаі 7 мільярдаў іен. Гэта сума на 1 мільярд перавышае ўвесь нацыянальны доўг Японіі да акупацыі ёю Манчжурыі. З вышэйуказанай сумы 6300500000 іен былі пакрыты пазыкамі. Адначасова журнал указвае, што за гэтыя два годы японскі ўрад выпусціў другіх пазык на суму 7860500000 іен для пакрыцця дзяржаўных расходаў. „Трэба адзначыць, — піша журнал, — што ўся руска-японская вайна 1904 — 1905 гг., прадаўжаўшаяся 19 месяцаў, стоіла Японіі толькі 1716000000 іен".

5 кастрычніка (ТАСС).

На заходнім фронце

НЬЮ-ЁРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва „Асошыэйтэд Прэс" сумесна з 9 іншымі замежнымі карэспандэнтамі наведалі лінію Мажыно. Па славам карэспандэнта на заходнім фронце пануе адносны спакой. Французскія войскі асцярожна і метадычна робяць націсканне на германскія часці. Па гэтым прычынам, — указвае карэспандэнт, — ёсць толькі невялікія страты. Як паведамляе карэспандэнт газеты „Нью Ёрк Таймс", па афіцыяльным падлікам, у першы месяц вайны на заходнім фронце было забіта і ранена каля 3000 германскіх салдат. Страты французскіх войск крыху меншыя.

НЬЮ-ЁРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). У поўафіцыяльных колах указваюць, што Францыя пануе над 6 германскімі прамысловымі цэнтрамі: Бергцаберн, Пірмасенс, Цвейбрукен, Саарбрукен, Саарлуі і Мерціг.

—:::—

Французскае камюніке аб ваенных дзеяннях

ПАРЫЖ, 5 кастрычніка (ТАСС). Як передае агенцтва „Гавас", у афіцыяльным камюніке французскага камандавання гаворыцца: „Вечар, 4 кастрычніка. Адмячаецца актыўнасць нашых патрулёў і засад ў различных пунктах фронта. Праціўнік прадпрыняў вылазку каля Пірмасенс і быў адкінут. Наша падводная лодка захапіла і прывяла ў порт германскае гандлёвае судно".

ПАРЫЖ, 5 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва „Гавас" перадае па радыё наступнае камюніке аб ваенных дзеяннях на заходнім фронце: „Раніца, 5 кастрычніка. Адмечаецца перастрэлка на розных пунктах фронта".

РЫМ, 5 кастрычніка (ТАСС). Люксембургскі карэспандэнт газеты «Мессадгеро» ў нумары ад 4 кастрычніка паведамляе, што на франка-германскім фронце адмячаецца актыўная падрыхтоўка з абодвух старон да ваенных дзеянняў у шырокім маштабе. Французы паставілі на лінію вялікую колькасць цяжкай артылерыі, абслугоўваемай атрадамі англійскіх маракоў. «Французскія войскі, — піша карэспандэнт, — праніклі ў вёскі Пэрль, Обернперл, Маймэлін, Зендорф, Полінге і Борг. Германская артылерыя вельмі жорстка адказвала французам, закідаючы атакуючых патокам гранат. Новыя пазіцыі, заваяваныя французамі, дамініруюць над мясцінамі Беш, Ненінг і Тэтінген. Благое надвор'е не пазволіла ўвясці ў дзеянне авіяцыю».

—:::—

Газета „Тан" аб магчымасці нямецкага наступлення

БРУСЕЛЬ, 5 кастрычніка (ТАСС). Французская газета «Тан» у номеры ад 4 кастрычніка разбірае пытанне аб тэхнічнай магчымасці для немцаў прадпрыняць шырокую атаку на заходнім фронце і, ў прыватнасці, выкарыстаць аўта-бронечасці. Газета піша: «Не магчыма разгадаць, якія ў апошні час намеры вышэйшага камандавання, але можна сказаць, што цяперашняе распалажэнне германскіх армій, шырока эшаланіраваных аж да ўнутранай часці краіны, не выключае магчымасці вялікага наступлення, каторае можа быць развернута па першаму сыгналу ў працягу некалькі дзён. Гэта наступленне, магчыма, адбудзецца адначасова ўздоўж усёй лініі нашых усходніх граніц».

—:::—

Нейтральныя краіны і вайна на моры

БЕРЛІН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Гавас, на працягу тыдня з 16 на 22 верасня ў Амстэрдам (Галандыя) прыбыло толькі 11 судоў і вышла з амстэрдамскага парта 9 судоў. У параўнанні з нармальнай абстаноўкай навігацыя ў амстэрдамскім парту скарацілася на 20%.

—:::—

Частковы прызыў у Галандыі

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Амстэрдама, што ў Галандыі аб'яўлен частковы прызыў ваеннаабавязаных, падлягаючых прызыву ў армію ў 1940 годзе.

—:::—

Скліканне германскага рэйхстага

БЕРЛІН, 5 кастрычніка (ТАСС). Газэты публікуюць наступнае афіцыяльнае паведамленне: „Заўтра 6-га кастрычніка ў 12 гадзін дня склікаецца рэйхстаг для заслухання дэкларацыі германскага ўрада".

—:::—

Паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі

БЕРЛІН, 5 кастрычніка (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступную зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі: «На ўсходнім фронце, на ўсход ад Віслы, прадаўжалася пачатая ўчора ачыстка мясцовасці ад астаткаў войск праціўніка. На заходнім фронце адзначаецца невялічкая актыўнасць артылерыі і разведальных самалётаў».

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрас рэдакцыі і Друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.